*Ірына Надольская*

## НАЦЯНАЛЬНЫ ФАЛЬКЛОР І СУЧАСНАЕ САДОВА-ПАРКАВАЕ ПРАЕКТАВАННЕ

Адным з прыярытэтных накірункаў горадабудаўніцтва ў сучаснай Беларусі з'яўляецца тэндэнцыя экалагізацыі і кантэкстуальнасці. Праблема адраджэння традыцый востра стаіць і ў гэтай сферы. У старажытных беларусаў даволі шмат звычаяў звязана з упрыгожваннем хат і двароў зелянінай, гэта была даніна культу раслiннасці і з'яўлялася абавязковым элементам абрадаў. Сучасныя навукоўцы істотна сістэматызавалі веды па фальклоры, этнаграфіі і традыцыйнай культуры беларусаў. Уяўленні аб уласцівасцях навакольнага свету ўваходзяць у сістэму міфалагічна-рэлігійных поглядаў нашых продкаў. Часткай гэтых ведаў з'яўляюцца пазнанні аб раслінным свеце, народная батаніка і метэаралогія - традыцыйныя экалагічныя веды. Яны адлюстроўваюць ступень пазнання і практычнага асвойвання законаў прыроды прадстаўнікамі таго ці іншага этнаса, а таму з яўляюцца важнай этнавызначальнай прыкметай. Экалагічныя веды беларусаў зафіксаваны пераважна ў вуснай форме - прыкметы, паданні, і г.д. [9]. Дахрысціянскія вераванні славян і звязаныя з імі легенды намі практычна забытыя, але яны і дагэтуль ўплываюць на нас, часта падсвядома і няўлоўна. Генетычная памяць ляжыць у аснове любой творчай дзейнасці, якая абапіраецца на этнічны стэрэатып мыслення і акумулюе асноўныя ідэі этнічнай культуры.

Аўтэнтычныя прадметы вясковага быту здольныя стаць непаўторнай адметнасцю сучаснага ландшафтнага дэкору. Пры стварэнні стылізаваных вясковых кампазіцый спецыялісты садова-паркавага мастацтва нават не мяркуюць, што тыя нярэдка ўтрымліваюць фальклорны падтэкст. Калі праанаалізаваць некаторыя з іх па асобных элементах, становіцца відавочна, што і гэты від мастацтва не пазбаўлены кантэксту, але мы аб гэтым не ведаем. Вось тыповыя прыклады: на фоне вясковага плятню замацавана кола ад возу, побач растуць сланечнікі, можа што яшчэ, але толькі, напэўна, этнографы здагадаюцца, што такім чынам ушанавалі Ярылу, бо кола - сімвалічны знак прысвечаны менавіта яму, а кветкі, вядома ж, дзеці сонца і сочаць за яго рухам увесь дзень [3, с. 112]. Каля бярвенчатай лазні робяць, надзвычай модны сення, садовы пруд, па берагах якога размясціліся кампазіцыі з прыгожых раслін і камянеў: аднак самае найцікавае ўпрыгожванне - драўляная фігурка. Але каб ведаць, што гэта Лазавік - значная істота ў беларускай міфалогіі [2, с. 93], трэба вывучаць ўласны этнічны фальклор. Недзе ў цяністым кутку сада расце папараць - адна з самых таямнічых і міфапаэтычных раслін - яна захоўвае сябе ад уплыву усіх таямнічых сіл. Тыя ж уласці надавалі палыну, архіліну і крапіве. Быльнік дапамагаў запазбегнуць хвароб. Асаблівай павагай ў беларусаў карысталася трава брат-сястра - фіалка трохколерная, якая мае венчык зпяціпялесткаў сіняга фіялетавага і жоўтага колеру [7]. У момант збору аб ей спявалі рытуальную баладу. Паступова адбывалася трансфармацыя семантыкі абрадавых дзей, звязаных з выкарыстаннем зеляніны <.. > і найбольшае развіцце атрымліваў эстэтычны бок абраду, імкненне да выражения эмоцый праз эстэтычныя праявы... [7]

У гісторыі садова-паркавага мастацтва ўжо быу перыяд своеасаблівага яго сінтэзу з дэкаратыўна прыкладным мастацтвам і фальклорам. Цікавасць да гісторыі і культуры старажытных славян ўзнікла ў пачатку XIX стагоддзя. Дваранін Андрэй Кайсараў у 1804 годзе напісаў і выдаў невялікую кнігу «Славянская і расійская міфалогія». Аналізуючы старажытныя рускія песні, казкі і звычаі, а таксама апісанні прадметаў старажытнага культу і побыту, якія дайшлі да яго, аўтар стварыў першы слоўнік славянскіх міфаў, дзе ў алфавітным парадку пералічваюцца старажытнаславянскія міфічныя істоты і духі, апісваюцца рытуалы пакланення ім. У канцы XIX стагоддзя пачынаюць узнікаць дваранскія сядзібы, арганізатары якіх імкнуцца адрадзіць «рускі стыль», забытае народнае мастацтва. Тут ўзводзяцца цэлыя комплексы арыгінальных пабудоў у духу старажытнарускага дойлідства, сад ўпрыгожваецца разьбянымі выявамі казачных волатаў, фантастычных птушак, размаляванымі агароджамі, брамамі, масткамі, лукамі і т. п [6, с. 244].

Беларусь у той гістарычны перыяд уваходзіла ў склад Раійскай імперыі, і шляхецкія сядзібы пераймалі гэтую моду, але на мясцовым падмурку яна, вядома, мела этнічны акрас. Творчасць мясцовых майстроў асабліва выявілася ў развіцці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (манументальны жывапіс, узорная аб'ёмная разьба па дрэве - «беларуская рэзь», кафлі і мастацкая кераміка, дэкаратыўнае шкло, гравюра на медзі, выраб дэкаратыўных прадметаў з металу). Мясцовыя чыгуналіцейныя заводы выпускалі вырабы, якія адрозніваюцца вытанчанасцю малюнка і разнастайнасцю формаў - балконы, кранштэйны, брамы, агароджы і інш. У іх арнамент уводзіліся стылізаваныя формы мясцовых раслін, чым дасягалася адпаведнасць архітэктурных вырабаў паркаваму асяроддзю [1, с. 20-21].

Сёння, дзякуючы прэсе, тэлебачанні, радыё, кіно, сусветнай мярэжы Інтэрнэт, чалавек пастаянна знаходзіцца пад уздзеяннем разнастайных культур. Урбаністычны лад жыцця прывёў да развіцця працэсаў глабалізацыі, фарміравання планетарнай свядомасці, распаўсюджвання і павелічэння ўплыву сродкаў камунікацыі, змяншэння ролі міжпакаленнай трансмісіі ў передачы культурнага вопыту. У садова-паркавым, як і ў іншых відах мастацтва, назіраюцца дзве супрацьлеглыя плыні, адна з якіх спароджаная працэсамі глабалізацыі - інтэграцыя мастацкіх ідэй, сціранне нацыянальных межаў. Уладальнікі загарадных сядзібаў размяшчаюць ва ўласных садах, надзвычай модных цяпер, інародных каляровых пластыкавых гномікаў, чарапашак, птушачак. Але разам з тым відавочна і тэндэнцыя самаідэнтыфікацыі - развіццё гістарычных генатыпаў сучаснымі дэкаратыўнымі сродкамі. У творах сучасных мастакоў нанава адраджаецца даўнішняе рамяство разьбы па дрэве, а менвіта - выразанне з суцэльных ствалоў фальклорных фігур: духі лесу, якія стаяць ў цяністых кутках саду, стылізаваныя жывёлы, фантастычныя і цапкам рэальныя - аддаюць павагу старажытнай славянскай міфалогіі. Арганічна ўвайшлі ў ландшфтнае афарменне традыцыйныя беларускія рамёствы - пляценне з прыродных матэрыялаў (лазы, корня, кары і інш.), мастацкая апрацоўка метала.

Эстэтыка роднай прыроды выступае ў якасці культурнай каштоўнасці. Адраджэнне традыцый нацыянальнай архітэктуры, садова-паркавага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народнай культуры - гэта свайго роду рэакцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

антаганізму на татальную глабалізацыю. «Пры гэтым не лішне нагадаць як быццам дабра вядомаю акалічнасць: традыцыйная народная культура - з'ява сінкрэтычная. Народнае мастацтва, мастацкія рамёствы развіваліся і бытавалі неадрыўна ад традыцыйнага жыццевага ўкладу, побыту, звычаяў, абрадаў, вераванняў, песень і, вядома ж, мовы. На жаль, сення гэтая адвечная асаблівасць практычна не ўлічваецца. Фалькларыст можа не арыентавацца ў традыцыйных рамёствах, спецыяліст у галіне рамёстваў абыякавы да вуснай народнай творчасці» - лічыць прафесар Я. Сахута [4]. На першы погляд, здаецца, яго словы ні як не дакранаюцца садова-паркавага мастацтва, алё гэта толькі на першы погляд. У сапраўдны момант, відавочна, патреба пашыраць механізмы супрацоўніцтва паміж фалькларыстамі, этнологамі, мастацтвазнаўцамі і практыкамі садова-паркавага праектавання. У постіндустрыяльным грамадстве ўзнікае небяспека страты чалавекам сваіх каранёў і традыцый. Агрэсіўнае гарадское наваколле без якіх-небудзь прыкмет этнічнай прыналежнасці патрабуе стварэння новага «іміджу» горада. Шмат раслін традыцыйнай экалагічнай культуры магчыма выкарыстоўваць для
стварэння ланшафтных кампазіцый. Такі падыход можа садзенічаць фарміраванню спрыяльнай этнічнай афарбоўцы ў сучаснай гарадской прасторы.

**Спіс літаратуры:**


1. Ангигов,ВГ.ПаркиБелоруссии/ВГАнгипов/подред И.Д Белогорцева- Мінск: Урадаай, 1975.-200с.
2. Вуплік, LP. Міфатогія бегврусау: навушьш-мегадычны дапаможнік /' LP. Вуглік. - Мінск: Сучасныя веды, 2005. - 150с.
3. Гуд ПА Беларускае Купашіе: камгшіцьй і семаніыка абрадавых дзей вучэбны дапаможнік дпн сіудангаў выпівйшых і навучэншў сярэдніх спейыіяльных усганоў кулыуры і мастащва / ПА Гуд - Мінск: БДУКМ, 2006. - 134с.
4. Круглый стол: «Актуальные проблемы художественного образования...». Мастацкая адукацыя і культура: Штокв. павук.-метад, часопю/Заснав.: Выщ-ва "Адукаиыя і выхаванне". - Мн.: Адукацыя і выхаванне, 2007 - № 3, сг. 16-17.
5. Курыгаіч, Г.М. Рсввішё сздоўніцша на Бепфугі ў другой голове XIX- гонаяку XX ст. / Г.М. Курыловіч Г. М. //С. 381—386.
6. Локстао, АЛ. Историко-культурные ландшафты Беларуси/А.Н. Лошгао. -Минск: Белорусская наука 2006.-468 с.
7. Наталевіч, В. Г. Апатрапеічшя функцыянапьнасць купальскіх раслін / ВГ. Натапевіч / Пытанні мастацівазнаўства эгаалогіі і фалькпарысіыкі: у 2 вып. - Вып.1 / Ін-т мастацівазнаўства этнаграфіі і фальклору імя ККралівы Нац акад швук Беларусі; навук.рэд А.ІЛакотка - Мінск: Права і эканоміка 2006. - С. 348 - 356.
8. Федорук, А.Т. Старинные парки Белоруссии: Инветаризация, стилевые особенности, сохранение и функциональное использование / А.Т. Федорук. - Мінск: Полымя, 1985. -92 с.
9. Шумскі, К.А. Традыцыйныя экалагічныя веды беларусаў у XIX - пачатку XX стст. / К.А. Шумскі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі: у 2 вып. - Вып. 1 / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі; навук. рэд. А.І. Лакотка. - Мінск : Права і эканоміка, 2006. - С. 502-506.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ